Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 18 (641) Пятніца, 20 мая 1966 года Год выдання XIX. Цана 1 кап.

## ФОРУМУ КАМСАМОЛІІ — ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАННЕ!

Бурліць камсамольская сталіца — Палац з'ездаў Крамля. Льюцца песні, гучаць розныя мовы.

Тут, у гэтых светлых сценах, б'ецца пульс самой маладосці ўсёй савецкай краіны. 23-мільённы камсамол даручыў сваім лепшым пасланцам прынесці прысягу на вернасць ідэалам бацькоў, на вернасць Камуністычнай партыі.

І, як клятву, урачыста паўтарае ўся зала: «Ленін з намі! Ленін з намі!».

Дзесяць гадзін раніцы. Песні рамантыкаў і шукальнікаў, якія толькі што напаўнялі залу, заглушаюцца громам апладысментаў — дэлегаты і госці з'езда вітаюць з'яўленне ў прэзідыуме таварышаў Л. І. Брэжнева, Г. І. Воранава, А. П. Кірыленкі, К. Т. Мазурава, А. Я. Пельшэ, М. В. Падгорнага, М. А. Суслава, А. М. Шалепіна, В. В. Грышына, П. Н. Дземічава, Д. Ф. Усцінава, І. В. Капітонава, Ф. Д. Кулакова, Б. М. Панамарова.

Першы сакратар ЦК ВЛКСМ С. П. Паўлаў паведамляе, што на з'езд прыехала 3.821 дэлегатаў. Ён аб'яўляе XV з'езд Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі адкрытым.

З дакладам «Справаздача Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ і задачы камсамола, што вынікаюць з рашэнняў XXIII з'езда КПСС» выступіў першы сакратар ЦК ВЛКСМ С. П. Паўлаў.

Вячэрняе пасяджэнне першага дня работы з'езда адкрылася справаздачай Цэнтральнай рэвізійнай камісіі ВЛКСМ. З дакладам выступіў старшыня гэтай рэвізійнай камісіі Р. А. Мусіеўскі.

Затым па дакладах пачаліся спрэчкі.

## ВОПЫТ, ВАРТЫ ПЕРАЙМАННЯ

На чарговым пасяджэнні парткома нашага універсітэта Т. І. Прытыцкая інфармавала аб рабоце камсамольскай арганізацыі філфака. Т. І. Прытыцкая адзначыла, што з верасня 1965 года па цяперашні час камітэтам камсамола філалагічнага факультэта праароблена вялікая работа па аказанню канкрэтнай дапамогі дэканату і партыйнай арганізацыі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў і камуністычнаму выхаванню моладзі. Сакратар і члены камітэта камсамола працуюць старанна, рэгулярна праводзяць пасяджэнні, абмяркоўваюць самыя надзённыя пытанні са студэнцкага жыцця факультэта. Галоўную ўвагу камітэт камсамола звяртае на акадэмічную і выхаваўчую работу.

На філфаку ўзяла пачатак «Ленінская эстафета слаўных спраў камсамольцаў БДУ», 1966-67 гады аб'яўлены ўдарнай камсамольскай двухгодкай, галоўнае накіраванне якой — развіццё ініцыятывы, самадзейнасці камсамольцаў, выхаванне моладзі на рэвалюцыйных традыцыях савецкага народа. На факультэце пачалося сацыялістычнае спаборніцтва камсамольскіх груп, штодзённа падводзяцца яго вынікі.

Для павышэння паспяховасці і палепшання кантролю за наведваннем студэнтамі заняткаў створана акадэмічная камісія. Аб рабоце гэтай камісіі можна чытаць у кожным нумары насценгазеты «Слова філолага» і пачуць па радыё ў інтэрнаце. У тым, што ў зімовую сесію 79 студэнтаў здалі экзамены на «выдатна» і 335 — на «выдатна» і «добра», вялікая заслуга камісіі.

Філолагі паспяхова спалучаюць вучобу з навукова-даследчай работай. У студэнцкіх навуковых гуртках 220 чалавек. Вялікую выхаваўчую работу праводзіць ідэалагічны сектар, які створаны пры камітэце камсамола. Для большай гласнасці яго работы створаны спецыяльны стэнд «На творчай ніве».

Многа слаўных і карысных спраў у школе маладых лектараў факультэта, дваццаць, камсамольцаў з'яўляюцца інструктарамі РК, больш трыццаці прапагандыстамі і агітатарамі. Таму не дзіўна, што камсамолія факультэта мае вялікія шэфскія сувязі з прадпрыемствамі горада Мінска, школамі, калгасамі і саўгасамі. Шмат студэнтаў удзельнічае і ў мастацкай самадзейнасці. Створаны такія калектывы, як тэатр мініятур, эстрадны аркестр, вакальная група і танцавальны калектыў. На аглядзе мастацкай самадзейнасці універсітэта факультэт заняў першае месца. На працягу навучальнага года шмат было праведзена і вечароў творчай моладзі. Усе гэтыя мерапрыемствы станоўча ўздзейнічаюць на вучэбна-выхаваўчую работу.

Партыйнае бюро філфака штодзённа праяўляе вялікія клопаты аб рабоце камсамольскай арганізацыі. У складзе камітэта камсамола пяць камуністаў.

Работа камітэта камсамола філалагічнага факультэта прызнана адной з лепшых. Унесена прапанова рэкамендаваць арганізацыям іншых факультэтаў універсітэта пераймаць вопыт работы ў камітэта камсамола філфака.

## ВЫВУЧАЕМ РАШЭННІ XXIII З'ЕЗДА КПСС

**Рашэнні XXIII з'езда КПСС натхняюць студэнтаў на добрую вучобу. Кожны асабіста з нас лічыць неабходным, як мага лепш вывучыць партыйныя дакументы з'езда.**

**Мы ў гуманітарным корпусе. Давайце заглянем у адну з яго аўдыторый. Якраз тут праходзяць заняткі па вывучэнню матэрыялаў XXIII з'езда КПСС. Вядзе іх Герой Савецкага Саюза, кандыдат гістарычных навук А. А. Філімонаў.**

**Выкладчык падрабязна спыняецца на важнейшых палажэннях Дырэктыў па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі ў нашай краіне. Пасля ён пачынае апытваць студэнцкую аўдыторыю. На першае яго пытанне падымаецца мноства рук.**

**Выступае Генадзь Цаленчук. Ён гаворыць аб тым, якое велізарнае значэнне маюць Дырэктывы па пяцігадоваму плану. Ніхто не можа не прызнаць велічных крокаў нашай Камуністычнай партыі. У адказе студэнта шмат канкрэтных прыкладаў, вытрымак з дакладаў таварышаў Л. І. Брэжнева, А. М. Касыгіна і многіх іншых удзельнікаў з'езда.**

**Адказ свайго аднакурсніка дапаўняе Наташа Манешына. Яна прыводзіць многа лічбаў і фактаў аб развіцці сельскай гаспадаркі, прамысловасці і навукі Беларусі. Наташа выдатна ведае перспектывы развіцця прамысловасці ў нашай рэспубліцы.**

**— Беларусь, — гаворыць студэнтка, — у хуткім часе пакрыецца густой сеткай газаправодаў і нафтапроводаў...**

**Ідуць семінарскія заняткі. Асабліва шмат выступаючых было па пытанню «XXIII з'езд КПСС аб задачах ідэалагічнай работы і выхаванню нашай моладзі».**

**Семінарскія прайшлі на высокім тэарэтычным і палітычным узроўні. Таму, што рашэнні з'езда адлюстроўваюць само жыццё, натхняюць нас на вялікія працоўныя здзяйсненні.**

**В. ДОБКІН.**

## РАСЦЕ БАЯВІТАСЦЬ НАСЦЕНГАЗЕТ

*Закончыўся агляд насценных газет і навуковых бюлетэняў універсітэта. Лепшымі прызнаны газеты «Слова філолага», «Рашым любую задачу», «Гісторык», «За мічурынскую біялогію». Агляд паказаў, што насценны друк значна вырас за гэты год. У ім паявіліся цікавыя рубрыкі, матэрыялы аб студэнцкім побыце і вучобе, аб выхаваўчай рабоце, выступленні выпускнікоў, якія неўзабаве будуць працаваць на вытворчасці, артыкулы аб рабоце членаў народнага кантролю і спорце. Многія газеты глыбока аналізуюць жыццё факультэта.*

*Але шкада, што часам у газетах не адчуваецца сапраўднай дзелавой крытыкі: аўтары гавораць пра розныя недахопы ў побыце, але без указання канкрэтных асоб. Такія заметкі, вядома, не прыносяць ніякой карысці. Ні ў адной насценгазеце няма рубрыкі «Па слядах нашых выступленняў», што гаворыць аб нездавальняючай рабоце рэдкалегіі. Сатыра і гумар павінны займаць адно з вядучых месц у газеце. На жаль, у «Географа» і «За мічурынскую біялогію» гэтых рубрык зусім няма. Затое газета «Хімік» шмат ўвагі аддае смеху. Тут амаль ў кожным нумары шмат карыкатур на абібокаў. Шкада толькі, што карыкатуры без подпісу, і часам цяжка здагадацца, каго ж крытыкавала рэдкалегія.*

*Работа рэдкалегіі ацэньваецца і па перыядычнасці выхаду газеты. У гэтых адносінах вылучаецца «Слова філолага», рэдкалегія выпусціла больш нумароў, чым усе астатнія. Акрамя гэтага пры газеце рэгулярна выходзяць два дадаткі—«Маладняк» і «Камсамольскі пражэктар». Асаблівай павагай сярод студэнтаў карыстаецца «Маладняк»..*

*З кожным годам мацнеюць і растуць навуковыя студэнцкія таварыствы. Іх работы атрымліваюць высокую ацэнку на Рэспубліканскіх аглядах. Але ў навуковых бюлютэнях даследаванні студэнтаў асвятляюцца слаба. А філалагічны, хімічны і гістарычны факультэты зусім не прадставілі на агляд бюлетэняў.*

*Рэдкалегіям насценгазет і бюлютэняў патрэбна ў будучым улічыць недахопы, якія адзначыла журы конкурса, зрабіць насценны друк баявым памочнікам парткома, рэктарата, камітэта камсамола ў выхаванні сапраўдных будаўнікоў камуністычнага грамадства.*

*М. ЧАРТКО,*
*член парткома універсітэта.*



**Студэнты універсітэта з вялікай увагай сачылі за работай V з'езда пісьменнікаў Беларусі.**

**НА ЗДЫМКУ: вы бачыце ўдзельніка з'езда паэта Максіма Лужаніна сярод выхаванцаў універсітэта.**

Фота **І. Супруна.**

## НА ЗВАННЕ ЦАЛІННІКА

Вясеннюю сесію справядліва называюць экзаменацыйнай за ўвесь навучальны год. І гэта сапраўды так, таму што яна патрабуе ад студэнтаў так многа старання, фізічнага маральнага і духоўнага напружання. Шмат клопатаў цяпер у цалiннікаў. Акрамя залікаў, экзаменаў, якія вось-вось пачнуцца ў іх, яны будуць здаваць яшчэ адзін экзамен — на ганаровае званне «цалiннік».

Практыка цалінных семестраў падказвае, што поспех у многім залежыць ад таго, наколькі студэнты будуць падрыхтаваны да работы. Добра ішлі справы ў тых атрадах, дзе было больш спецыялістаў, больш прапагандыстаў, самадзейных артыстаў. Таму нашым камітэтам камсамола ўжо сёння вядзецца старанны адбор і падрыхтоўка моладзі для работы на цаліне. Вырашаецца пытанне канкрэтнага размяшчэння кадраў на месцы работы тут, ужо ва універсітэце, а не на будоўлях. Гэта дасць вялікую эканомію каштоўнага часу. Камітэт камсамола рэгулярна праводзіць семінары, дзе вялікая ўвага ўдзяляецца і такому важнаму пытанню, як спалучэнне асноўнай і грамадскай работы цалінніка. Тут, як правіла, дзеляцца сваім вопытам работы «бывалыя» цаліннікі.

Днямі правялі такі семінар з рэдактарамі і рэдкалегіямі цалінных насценных газет. Гутарка вялася аб тым, якія пытанні трэба ўзнімаць газетам, пра іх рубрыкі, афармленне. Кожнай рэдкалегіяй быў прадстаўлены свой перспектыўны план работы, якія абмяркаваліся прысутнымі.

Удзельнікі семінара выказалі шмат карысных парад і прапаноў як па арганізацыі работы рэдкалегій цалінных насценных газет, так і па іншых пытаннях выхаваўчай работы на цаліне.

**А. Паўлаў.**

## УВАГА! УВАГА!

**Студэнтам, якія не паедуць працаваць пасля летняй сесіі на цалінныя будоўлі, у Чэхаславацкую Сацыялістычную Рэспубліку, на будоўлі Беларусі і Мінска, неабходна адпрацаваць па шэсць рабочых дзён на стадыёне «Дынама». Пачатак работы з 25 чэрвеня.**

